Водгук

на аўтарэферат дысертацыі Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча “Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.”, прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыльнасці 13. 00. 01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Зварот Бітчанкі С.М. да рэтраспектыўнага аналізу працэсу стварэння вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для школ беларускіх губерняў Расійскай імперыі вельмі апраўданы як з пункту гледжання невывучанасці дадзенай праблемы, так і неабходнасці асэнсавання тэорыі і практыкі стварэння падручнікаў па гісторыі Беларусі. У аўтарэфераце правільна адзначаецца, што абраная навуковая праблема мае высокую навуковую актуальнасць для асэнсавання шматлікіх істотных пытанняў гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі XIX – пачатку XX ст. Фактычна Бітчанка С.М. першым з даследчыкаў звярнуўся да глыбокай распрацоўкі абазначанай навуковай праблемы.

У дысертацыі, адпаведна зместу аўтарэферата, дакладна і навукова абгрунтавана вызначаны мэта і задачы даследавання. Звяртае на сябе ўвагу маштабнасць вырашаных у даследаванні задач, якія маюць вялікую навуковую і практычную значнасць. Адпаведна навуковым задачам вызначана структура дысертацыйнага даследавання, якое ўключае чатыры главы. Палажэнні, якія выносяцца на абарону, утрымліваюць новыя навуковыя вынікі. На аснове аналізу шырокага кола дакументальных крыніц, у тым ліку выяўленых саіскальнікам у архівасховішчах і бібліятэках Беларусі, Расіі, Літвы, раскрыты ў дысертацыі канцэптуальна-ідэалагічныя, структурна-зместавыя, навукова-метадычныя асновы распрацоўкі і эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі. Доказна сканструявана гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі, вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і паэтапная эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў школьнай вучэбнай літаратуры. Пераканаўча ахарактарызаваны навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-педагагічныя аспекты, звязаныя з яе выкарыстаннем у навучальных установах беларускіх губерняў Расійскай імперыі.

Змест аўтарэферата сведчыць, што Бітчанка С.М. валодае ўзроўнем навуковай кваліфікацыі, які адпавядае патрабаванням “Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы

Беларусь" і яму можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13. 00. 01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Дэкан гістарычнага факультэта Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта,
доктар гістарычных навук, прафесар А.Г. Каханоўскі

05.06.2023

Каханоўскага А.Г.

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Зам. начальника управления
организационно-документационного обеспечения
Е.И. Зинкевич
«05» 06 2023 г.

З водзывам азнаёмлены 08.06.2023 С.М. Бітчанка

Отзыв
на автореферат диссертационного исследования Битченко С.М.
“Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стст.”,
представленного на соискание ученой степени кандидата педагогических наук по специальности 13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования

Автореферат диссертационного исследования соискателя Битченко С.М. подготовлен на важную и актуальную тему, поскольку именно в период получение школьного образования в процессе изучения гуманитарных дисциплин у подрастающего поколения формируются основы мировосприятия, гражданственности и государственного патриотзима, уважительного отношения к историческому прошлому своей страны.

Научный анализ эволюции создания школьной учебной литературы по истории Беларуси в период нахождения белорусских земель в составе Российской империи в XIX – начале XX вв., успешно осуществленный соискателем, позволит проследить и правильно осмыслить истоки основных направлений развития школьного исторического образования в условиях государственного суверинитета Республики Беларусь.

Соискателем Битченко С.М. тщательным образом были проанализированы доступные источники и историография по теме диссертационного исследования, что позволило ему изучить ее полно и всесторонне. Так, им были определены общие цели внутренней политики правительства Российской империи в области школьного исторического образования на белорусских землях в XIX – начале XX столетий; выявлены особенности реконструирования образа исторического прошлого белорусских земель, хорошо вписывающихся в контекст общеимперской исторической концепции по закреплению доминирования Петербурга на национальных окраинах империи через систему школьного исторического образования по воспитанию школьников и их родителей в духе верности государству Романовых. Также соискателем охарактеризованы научные и педагогические основы создания школьной учебной исторической литературы, отражающей концептуальные основы развития белорусских земель в их прошлом.

Значимым подтверждением важности диссертационного исследования Битченко С.М. является то, что оно имеет весомое практическое приложение в виде востребованного своей деятельностью музея «Вучэбная кніга ў гісторыі адукацыі», функционирующего в ГУО “Академия последипломного образования”.

Диссертационное исследование соискателя имеет солидную научную апробацию, представленную в 14 публикациях, 3 из них – в рецензируемом издании, 7 статей – в сборнике научных трудов, рекомендованном Высшей аттестационной комиссией Республики Беларусь для опубликования результатов диссертационных исследований.

Таким образом, на основании вышеизложеного следует сделать вывод о значимости подготовленного диссертационного исследования, а также о том, что его автор, соискатель Битченко С.М., заслуживает присуждения ученой степени кандидата педагогических наук по специальности 13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования.

Отзыв на автореферат диссертационного исследования Битченко С.М. “Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX стст.” заслушан и утвержден на заседании кафедры археологии, истории Беларуси и специальных исторических дисциплин историко-филологического факультета учреждения образования “Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова” № 14 от 30.05.2023 г.

Заведующий кафедрой археологии,
истории Беларуси
и специальных исторических дисциплин В.В. Табунов

Подпись В.В. Табунова
заверяю
начальник отдела кадров
учреждения образования
«Могилёвский государственный
университет имени А.А. Кулешова»
Денова
06.06.2023

З водзывам азнаёмлены 08.06.2023 С.М. Бітчэнка

# ВОДЗЫЎ

аб аўтарэферацe дысертацыі Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча «Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання абумоўлена мэтазгоднасцю ўстанаўлення на аснове ажыццяўлення рэтраспектыўнага аналізу пераемнасці ў працэсе эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі паміж перыядам XIX – пачатку XX ст. у Расійскай імперыі і сучасным перыядам развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. У гэтай сувязі, вызначаная тэма дысертацыі з'яўляецца запатрабаванай з пазіцыі развіцця сучаснай педагагічнай навукі.

Даследаванне ажыццёўлена ў рэчышчы прыярытэтных тэарэтычных падыходаў і характарызуецца цэласнасцю, навуковасцю, канцэптуальнасцю. Прадстаўленая структура даследавання сістэмна выбудаваная і зразумелая. Аўтарам прафесійна прымяняюцца агульнанавуковыя і спецыяльныя метады даследавання для комплекснага аналізу. Дысертант карэктна дае новыя ўдакладненні азначэнням некаторых ключавых паняццяў і кампетэнтна абгрунтоўвае атрыманыя вынікі, высновы і рэкамендацыі. Аўтарэферат сведчыць, што дысертацыя з'яўляецца лагічна завершанай паўнавартаснай навукова-даследчай працай, выкананай аўтарам самастойна на дастаткова высокім навуковым узроўні. Аўтарэферат досыць поўна адлюстроўвае сутнасць даследавання і адказвае ўстаноўленным навуковым патрабаванням.

Распрацаваная дысертантам гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., якая складаецца з канцэптуальна-ідэалагічнага, структурна-зместавага і навукова-метадычнага кампанентаў, з'яўляецца педагагічным інструментам навуковага аналізу падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з мэтай іх комплекснага вывучэння для сістэмнага разумення эвалюцыйнага развіцця, удасканалення сучасных школьных падручнікаў па айчыннай гісторыі і павышэння эфектыўнасці выкарыстання іх у адукацыйным працэсе.

Аўтарэферат дысертацыі адлюстроўвае ўсе этапы даследавання. Вызначаныя вынікі і высновы можна характарызаваць як навукова абгрунтаваныя гісторыка-педагагічныя распрацоўкі, якія забяспечваюць вырашэнне пастаўленых даследчых задач.

Дысертацыя пабудавана на аснове ўпарадкаванага гісторыка-педагагічнага дакументальна-архіўнага матэрыялу, змяшчае дастатковую колькасць факталагічных зыходных дадзеных, кваліфікавана напісана і аформлена. Задачы, пастаўленыя ў дысертацыйным даследаванні, вычэрпваюць аб'ект даследавання. Яны знайшлі канкрэтнае вырашэнне на тэарэтычным і практычным узроўнях. Карэктна, з пазіцыі разгляданай праблемы ў дысертацыі аналізуецца школьная літаратура па гісторыі Беларусі вывучаемага перыяду.

Істотнай станоўчай асаблівасцю дысертацыі варта прызнаць яе прадуманую логіка-структурную сістэмнасць і паслядоўнасць у раскрыцці асвятлянай праблемы, яснасць выкладу матэрыялу. Можна канстатаваць, што аўтар прыцягвае для супастаўляльнага аналізу разнастайныя крыніцы і матэрыялы, што робіць высновы дысертанта цалкам аб'ектыўнымі. Навуковыя палажэнні і падыходы даследчыка дабратворна адаб'юцца на далейшым удасканаленні навукова-метадычнай падрыхтоўкі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Дысертацыя змястоўная, даследаванне выбудавана асэнсавана і лагічна.

Навуковая вартасць дысертацыйнага даследавання заключаецца ў выяўленні аўтарам на базе шырокага кола гісторыка-педагагічных крыніц эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. На аснове сучаснага асэнсавання праблемы захавання гістарычнай памяці і ролі ў гэтым гістарычнай адукацыі аўтарам былі раскрыты тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі; сканструявана гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; выяўлены канцэптуальна-ідэалагічныя асновы гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі і поглядах педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў; вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм; ахарактарызаваны навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі.

Зыходзячы з аналізу аўтарэферата, можна канстатаваць, што дысертацыйнае даследаванне праведзена на дастаткова высокім навуковым узроўні, адпавядае патрабаванням ВАК РБ, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі ДУ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт»
доктар педагагічных навук, прафесар Т.А. Лапацік

Учреждение образования
"... ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ... УНИВЕРСИТЕТ"
Т.А. Лапатик
УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела кадров МГЛУ
Г.И. Кузьмич
09 06 2023

З водзывам азнаёмлены 12.06.2023

ОТЗЫВ

на автореферат диссертации Битченко Сергея Михайловича «Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.», представленной на соискание ученой степени кандидата педагогических наук по специальности 13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования

Актуальность темы исследования обусловлена прежде всего социальной потребностью и социальным заказом, отраженным в ведущем компоненте цели образования в «Кодексе об образовании», Концепции национальной безопасности Республики Беларусь, Программе патриотического воспитания населения Республики Беларусь на 2022–2025 годы и ряде других нормативных правовых документов. На практическую востребованность данного исследования указывает особое внимание системы образования и общества к методике преподавания истории, историческому образованию и особенно его содержательному компоненту в условиях трансформационных процессов. Миссия образования заключается в непрерывной передаче объективных знаний подрастающим поколениям, в системе которых историческому знанию отведена ключевая роль, поскольку именно оно позволяет создавать прочный фундамент преемственности в общественном сознании.

Представленная работа имеет высокую научную значимость, поскольку выявление эволюции создания школьной учебной литературы по истории Беларуси для учащихся белорусских губерний Российской империи в XIX – начале XX вв. позволяет увидеть закономерности взаимосвязи государственной политики в сфере школьного исторического образования, взглядов российских и белорусских педагогов на воспитательную роль истории в формировании национального самосознания учащихся и отражении этих процессов в документах, регламентирующих и обеспечивающих образовательный процесс: учебных программах, учебных текстах, учебном материале. Особенно ценными являются результаты данной работы, поскольку автору удалось выявить и проследить эволюционный процесс развития национальной учебной литературы, который протекал внутри процесса развития российского образования в указанный период.

В автореферате обоснована и представлена эволюция концептуально-идеологических основ истории Беларуси в совокупности трех видов

концепций: отрицающих субъектность белорусского народа, нейтральных к белорусской субъектности и опирающихся на белорусскую субъектность, связанные с белорусскоцентрическим пониманием истории.

В исследовании рассматриваются 4 значимых этапа эволюции государственно-идеологических основ создания школьной учебной литературы по истории Беларуси. Показано, что важным опосредованным фактором эволюционного влияния на концептуализацию идеологических основ истории Беларуси выступили взгляды представителей российского научно-педагогического сообщества, которые не имели системного характера, особенно в аспекте изучения истории Беларуси как части истории России. Значительный интерес для современных дидактов в области истории, методистов и педагогов представляют выявленные особенности дидактического конструирования структуры учебных материалов и текстов, которые, говоря современным языком, отвечают не только дидактико-методическим, но и когнитивным требованиям.

Текст автореферата содержит глубокое содержательное обоснование решения поставленных задач. Представленные в автореферате результаты диссертационного исследования обладают новизной, теоретической и практической значимостью, вносят несомненный вклад в развитие история педагогики и образования. Работа является законченной и выполнена автором самостоятельно на высоком научном уровне. По теме диссертации имеется 14 публикаций. Автореферат написан квалифицированно и аккуратно оформлен.

Анализ содержания автореферата позволяет сделать вывод о том, что его автор, Битченко Сергей Михайлович, заслуживает присуждения искомой ученой степени кандидата педагогических наук по специальности 13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования.

Доцент кафедры молодежной политики и
социокультурных коммуникаций
ГУО «Республиканский институт высшей школы»,
кандидат педагогических наук, доцент В.Н. Пунчик

Подпись удостоверяю
Начальник центра кадрового и
документационного обеспечения С.Н. Зубарь
01.08.2023

Государственное учреждение образования «Республиканский институт высшей школы» Центр кадрового и документационного обеспечения

З водзывам азнаёмлены 12.06.2023 С.М. Бітчэнка

**ВОДГУК**

**на аўтарэферат дысертацыі Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча
«Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі
Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.»,
прадстаўленай на суісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці
13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі**

Актуальнасць дысертацыйнага даследавання вызначаецца, як справядліва заўважае аўтар аўтарэферата, абумоўлена, у першую чаргу, неабходнасцю ўмацавання нацыянальнай бяспекі і забяспячэння ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь праз фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнальнай самасвядомасці сучасных вучняў на падставе дзяржаўнай ідэалогіі.

Тэма дысертацыі прысвечана распрацоўцы новых падыходаў да вывучэння з пункту гледжання канцэптуальна-ідэалагічнага, структурна-зместавага і навукова-метадычнага кампанентаў вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., у сувязі з гэтым яна, безумоўна, з’яўляецца запатрабаванай з пазіцыі развіцця сучаснай педагагічнай навукі і гістарычнай адукацыі.

Да вартасцяў рэцэнзаванай дысертацыі можна аднесці наступнае.

Па-першае, у працы выяўлена эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. у гістарычнай рэтраспектыве на аснове прапанаванай аўтарам сістэмы крытэрыяў і паказчыкаў, якая ўлічвае назапашаны гісторыка-педагагічны вопыт і грунтуецца на сукупнасці ўстаноўленых параметраў.

Па-другое, у дысертацыі распрацавана мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., якая ўяўляе сабой сукупнасць пэўных структурных кампанентаў, што дазваляе па іншаму паглядзець на праблему гістарычнай адукацыі вывучаемага суіскальнікам перыяду.

Па-трэцяе, асаблівую навуковую цікавасць выклікае вылучэнне суіскальнікам канцэптуальна-ідэалагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі перыяду Расійскай імперыі, а таксама структурна-зместавых асноў, што па свайму напаўненню адпавядалі патрабаванням вучэбных праграмм і ў той жа час падавалі вобразы гістарычнага мінулага Беларусі з пункту гледжання дзяржаваўтваральнай і гістарычнай суб’ектыўнаці беларусаў у перыяд Старажытнай Русі, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі.

Палажэнні складаюць навуковую сутнасць дысертацыі і з'яўляюцца новымі навуковымі вынікамі, атрыманымі асабіста суіскальнікам.

Вырашаныя задачы ў дысертацыйным даследаванні з'яўляюцца актуальнымі для Рэспублікі Беларусь. Вынікі працы маюць высокі навукова-прыкладны ўзровень і ўяўляюць цікавасць для сумежных даследаванняў.

Неабходна таксама адзначыць дастатковы ўзровень апублікаванасці вынікаў дысертацыі, якія прадстаўлены ў 14 навуковых працах, апрабаваны на міжнародных навуковых канферэнцыях у Рэспубліцы Беларусь.

У цэлым дысертацыя мае высокую навуковую і практычную вартасць, змяшчае новыя навуковыя вынікі і развівае тэорыю і практыку педагагічнай навукі. Навуковая вартасць дысертацыйнай працы складаецца ў тым, што аўтарам былі распрацаваны і абгрунтаваны прапановы па фарміраванні арганізацыйнага механізма фарміравання, захавання і ўмацавання градзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці вучняў Рэспублікі Беларусь.

Улічваючы вышэй сказанае, лічым, што дысертацыйная праца адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да кандыдацкай дысертацыі па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі і аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.

Водгук на аўтарэферат абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні кафедры гісторыі і турызму гуманітарнага факультэта ўстановы адукацыі "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай" (Пратакол № 11 ад 23 мая 2023 г.).

Загадчыца кафедры гісторыі і турызму
гуманітарнага факультэта
ўстановы адукацыі
"Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай",
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.І. Корсак

Подпись Корсак А.И. удостоверяю
Специалист по кадрам
Аддзел кадраў
Анисимова

З водгукам азнаёмлены 13.06.2023 С.М. Бітчанка

**ВОДЗЫЎ**
**аб аўтарэфераце дысертацыі Бітчанка Сяргея Міхайлавіча «Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі**

Змест аўтарэферата дысертацыі «Эвалюцыя стварэння вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.», прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі, адпавядае заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.

Актуальнасць тэмы не выклікае сумненняў. У першую чаргу яна абумоўлена адсутнасцю ў айчыннай гісторыі педагогікі абагульняючай працы, прысвечанай аналізу працэса стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Нягледзячы на вялікую ўвагу беларускіх навукоўцаў да праблемы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры, вывучаліся толькі яе асобныя аспекты. Распрацоўка праблемы, заяўленай у якасці тэмы дысертацыі, дазволіць у значнай ступені запоўніць існуючыя прабелы. Сістэматызацыя розных падыходаў да праблемы дазволіць больш глыбока ўсвядоміць і асэнсаваць эвалюцыю стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст., стымулюе навуковы творчы пошук і паспрыяе ўзмацненню цікавасці да праблемы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры ў цэлым.

Суіскальнік паспяхова справіўся з задачай, самастойна падрыхтаваў высокакваліфікаванае даследаванне, у якім ўпершыню ў гісторыі педагогікі Беларусі вывучана эвалюцыя дзяржаўна-ідэалагічных асноў стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і выяўлены яе этапы:

- 1803–1833 гг. – афіцыйны дазвол паланізацыі і паланафільства ў дачыненні да школьнай гістарычнай адукацыі;
- 1833–1864 гг. – афіцыйная забарона паланізацыі і паланафільства, рэалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць» ва ўмовах пашырэння тэорыі афіцыйнай народнасці;
- 1864–1884 гг. – «оффиціально-охранительный», які характарызуецца стварэннем шэрагу спецыяльных заканадаўчых актаў, накіраваных на дэпаланізацыю адукацыі ў беларускіх губернях;
- 1884–1917 гг. – узмацненне ідэалагічнай накіраванасці дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ва ўмовах афармлення ідэі замацавання вялікарускай самасвядомасці на аснове канцэпцыі заходнерусізму.

Шматгранны падыход да вырашэння навуковай праблемы дазволіў аўтару выйсці на новы якасны ўзровень ў вырашэнні пастаўленых даследчых задач і атрымаць у працэсе даследавання вынікі, якія характарызуюць высокую ступень навізны выкананага гісторыка-педагагічнага даследавання:

- раскрыты дзяржаўна-ідэалагічныя, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя,

гісторыка-педагагічныя асновы даследавання эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі;

- сканструявана гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.;

- выяўлена эвалюцыя канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі і поглядах педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў;

- вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм.

Абгрунтаванасць і дакладнасць заключаных высноў, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечаны выкарыстаннем значнай колькасці крыніц (260), багатым дадаткам (290 старонак). Практычным увасабленнем вынікаў дысертацыі з'яўляецца арганізаваны ў 2019 г. музей «Вучэбная кніга ў гісторыі адукацыі» ў дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» з мэтай далучэння педагагічных работнікаў да вывучэння гісторыка-педагагічный спадчыны беларускага народа.

У аўтарэфераце адлюстраваны асноўны змест дысертацыі, яе структура, вынікі, палажэнні, якія выносяцца на абарону. Аўтарэферат адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў, Інструкцыі аб афармленні дысертацыі і аўтарэферата.

Прызнаючы несумненную актуальнасць і навуковую каштоўнасць дысертацыйнага даследвання, аўтару было б пажадана абгрунтаваць храналагічныя рамкі даследвання (XIX – пачатак XX ст.).

Трэба, аднак, заўважыць, што выказаная заўвага ні ў якім разе не можа паўплываць на высокую адзнаку прадстаўленай працы. Бітчанка Сяргей Міхайлавіч безумоўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата педагагічных навук по спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Водгук на аўтарэферат заслуханы і абмеркаваны на пасяджэнні кафедры педагогікі сацыяльна-педагагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна (пратакол № 18, ад 01 чэрвеня 2023 г.).

Дацэнт кафедры педагогікі
Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт І.І.Петрашэвіч

АДДЗЕЛ КАДРАЎ
Подпіс Петрашэвіч І.І. пацвярджаю
Нач. АК БрДУ

З водзывам азнаёмлены 13.06.2023 С.М.Бітчанка

# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі Бітчанкі Сяргея Міхайлавіча
«ЭВАЛЮЦЫЯ СТВАРЭННЯ ШКОЛЬНАЙ ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX ст.».

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства неабходнай умовай для ўмацавання нацыянальнай бяспекі і забеспячэння ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь з'яўляецца фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці вучняў на аснове дзяржаўнай ідэалогіі. Адным з найважнейшых фактараў іх фарміравання і замацавання з'яўляюцца школьная гістарычная адукацыя і ідэалагічна верыфікаваны падручнік па роднай гісторыі. Захаванне гістарычнай памяці з'яўляецца неад'емнай часткай палітыкі дзяржавы, накіраванай на папярэджанне скажэння ідэнтыфікацыйнай гістарычнай асновы шляхам стварэння механізма пераемнасці ў грамадскай свядомасці найважнейшых падзей, з'яў, працэсаў гісторыі, дзейнасці выдатных асоб.

Актуальнасць даследавання абумоўлена мэтазгоднасцю ажыццяўлення гістарычна рэтраспектыўнага аналізу працэсу стварэння школьнай вучэб най літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. з пункту гледжання пераем насці з сучаснай дзяржаўнай гістарычнай палітыкай, тэорыяй і практыкай стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. У педагагічнай навуцы эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літара туры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. не з'ўлялася прадметам комплекснага даследавання, што актуалізавана сучасным этапам мадэрнізацыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

У гэтым кантэксце дысертацыйнае даследаванне С.М. Бітчанкі ўяўляецца нам дастаткова актуальным і своечасовым. На нашу думку, праведзенае суіскальнікам даследаванне дапаможа ліквідаваць гэтыя недахопы.

Аўтарэферат дысертацыі падрыхтаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК і дазваляе атрымаць цэласнае ўяўленне аб дысертацыйным даследаванні як паўнавартаснай завершанай навуковай працы, у змесце якой аўтар прадпрыняў спробу выяўленне эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Аўтарам раскрываюцца тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі; сканструявана гісторыка-педагагічная мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; выяўлены канцэптуальна-ідэалагічныя асновы гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гіста рычнай адукацыі і поглядах педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў.

Вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыю вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм; ахарактарызаваны навукова-педагагічныя асновы стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбна-метадычныя аспекты яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Навуковая вартасць дысертацыі абумоўлена тым, што ў дадзенай працы ўпершыню сутнасна раскрыты дзяржаўна-ідэалагічныя, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя, гісторыка-педагагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі; сканструявана гісторыка-педагагічня мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.; выяўлена эвалюцыя канцэптуальна ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі і поглядах педагогаў наконт выхаваўчай ролі гісторыі ў фарміраванні асноў нацыянальнай самасвядомасці вучняў; вызначаны асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыя вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм.

Работа выканана на падставе навуковай літаратуры, апублікаваных дакументаў і шырокага кола архіўных крыніц, якія былі ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак. Тэарэтычныя асновы дысертацыйнага даследавання ў сукупнасці з шырокай крыніцазнаўчай і гістарыяграфічнай базай дазволілі суіскальніку прыйсці да абгрунтаваных высноў, якія можна лічыць прынцыпова новымі ў беларускай педагагічнай навуцы.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе ва ўстановах вышэйшай адукацыі, у працэсе падрыхтоўкі падручнікаў і дапаможнікаў па гісторыі Беларусі дадзенага перыяду.

На падставе вышэйсказанага, суіскальніку С.М. Бітчанка можа быць прысвоена вучоная ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі за:

– распрацоўку гісторыка-педагагічнай мадэлі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. ў сукупнасці яе канцэптуальна-ідэалагічнага, структурна-зместавага, навукова-метадычнага кампанентаў;

- выяўленне канцэптуальных кірункаў эвалюцыі канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі;

- раскрыццё асаблівасцяў дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.

Дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі
і методыкі выкладання гісторыі
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага
ўніверсітэта імя Максіма Танка,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт А.А. Корзюк

Подпись Корзюка А.А.
заверяю зам. начальника ОК БГПУ
С.Б. Пешенко
"13" 06 2023 г

АДДЗЕЛ КАДРАЎ

З водзывам азнаёмлены 15-06-2023 С.М. Бітчанка

# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі
«Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.» Бітчанка Сяргея Міхайлавіча, прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Школьны падручнік з'яўляецца галоўнай крыніцай вучэбнай інфармацыі, які адлюстроўвае існуючую адукацыйную сістэму. Ад якасці школьнага падручніка ў значнай ступені залежыць якасць навучання. Гісторыя стварэння падручнікаў па гісторыі ў Расійскай імперыі мае даўняю традыцыю. Шматлікія пытанні навучання гісторыі, актуальныя ў сённяшні час, ужо разглядаліся гісторыкамі і педагогамі-метадыстамі Расійскай імперыі, таму вывучэнне іх вопыта будзе карысным для распрацоўкі сучасных падручнікаў па гісторыі.

Праблемнае поле і змест дысертацыі адпавядаюць галіне навукі і спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі. Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання вызначаецца неабходнасцю фарміравання ў вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі грамадзянскасці, патрыятызму, гістарычнай памяці і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі, што ў значнай ступені залежыць ад таго, як арганізавана школьная гістарычная адукацыя і якія падручнікі выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе.

Не выклікае прынцыповых пярэчанняў фармулёўкі мэты, задач, аб'екта і прадмета праведзенага даследавання. У аўтарэфераце дысертацыі прадстаўлен аналіз гістарыяграфіі праблемы, які дазволіў абгрунтаваць неабходнасць распрацоўкі тэмы на ўзроўні дысертацыйнага даследавання.

Навуковая каштоўнасць даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускай педагагічнай навуцы праведзены аналіз літаратуры па гісторыі беларускіх зямель, якая выкарыстоўвалася ў Віленскай (Беларускай) вучэбнай акрузе.

Разам з тым неабходна адзначыць, што рэцэнзуемы аўтарэферат не пазбаўлены некаторых навуковых недахопаў і нешматлікіх недакладнасцей, сярод якіх неабходна адзначыць наступныя:

1) на с. 1 сярод навукоўцаў, якія распрацоўвалі заканамернасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, беларускай адукацыі і культуры, названы Л.П.Бушчык, У.Г. Карцоў, на с. 10 адзначана, што ў 1960–1980-я гады выйшлі першыя абагульняючыя працы па гісторыі адукацыі Беларусі і сярод навукоўцаў названы Л.П.Бушчык, Ш.І.Ганелін і Э.Д Дняпроў, М.А.Ткачоў, якія гэтай праблематыкай не займаліся;

2) з тэксту аўтарэферата не зразумела, з якой мэтай і як аўтар удакладняў паняцце «эвалюцыя», якое нельга аднесці да гісторыка-педагагічнай тэрміналогіі;

3) у якасці прадмета даследавання ў дысертацыі вылучана эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Аднак у тэксце аўтарэферата прыводзяцца выданні, якія нельга аднесці да вучэбнай літаратуры, таму што яны мелі навукова-папулярны характар, і аўтары не прызначалі іх для выкарыстання ў школах, напрыклад, «Кароткая гісторыя Беларусі» В. Ластоўскага, «Историческая памятка западноруссу» У. Ангельскага (с. 20). Аўтару дысертацыі трэба было правесці класіфікацыю літаратуры, якую выкарыстоўвалі настаўнікі ў вучэбным працэсе.

Выказаныя заўвагі не зніжаюць значнасці праведзенай работы, якая ўносіць уклад у развіццё поглядаў на распрацоўку падручнікаў па гісторыі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Высновы дысертацыі з'яўляюцца навукова абгрунтаванымі і ўяўляюць тэарэтычную і практычную значнасць. Асноўныя вынікі даследавання адлюстраваны ў 14 навуковых артыкулах і выступленнях аўтара на навукова-практычных канферэнцыях.

Аўтарэферат дае ўяўленне аб тым, што С.М.Бітчанка правёў актуальнае, самастойнае даследаванне па адной з праблем беларускай педагагічнай навукі і змяшчае новыя навуковыя вынікі, якія могуць быць выкарыстаны для вывучэння гісторыі педагагічнай думкі і школьнай гістарычнай адукацыі; павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі; афармлення музейных экспазіцый, прысвечаных вучэбнаму кнігавыданню па гісторыі. Праца С.М.Бітчанка задавальняе патрабаванням, што прад'яўляюцца ВАК Рэспублікі Беларусь да кандыдацкіх дысертацыйных работ і заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Вядучы навуковы супрацоўнік
Інстытута гісторыі НАН Беларусі,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт М.А. Краснова

Подпіс Красновай М.А. сведчу
Вяд. спецыяліст па кадрах
«09» 06 2023 г.

З водгукам азнаёмлены 16.06.2023 С.М. Бітчанка

# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі **БІТЧАНКІ Сяргея Міхайлавіча** ***«Эвалюцыя стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст.»*** на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

У дысертацыйным даследаванні С.М. Бітчанкі вывучана пытанне эвалюцыі стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі ў перыяд яе знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. Храналагічныя межы дысертацыйна работы вызначаны самой праблематыкай даследавання.

Актуальнасць даследавання абумоўлена мэтазгоднасцю ажыццяўлення гістарычна рэтраспектыўнага аналізу працэсу стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для вучняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. з пункту гледжання пераемнасці з сучаснай дзяржаўнай гістарычнай палітыкай, тэорыяй і практыкай стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Дагэтуль у педагагічнай навуцы заяўленая праблематыка не з'яўлялася прадметам комплекснага даследавання, што павышае навуковую значнасць дысертацыі.

Адзначым лагічнасць і паслядоўнасць палажэнняў, якія выносяцца аўтарам на абарону. Прадмет даследавання раскрыты як у тэксце аўтарэферата, так і ў заключэнні да дысертацыйнага работы. Палажэнні, якія выносяцца на абарону валодаюць безумоўнай навізной, а таксама дазваляюць судзіць аб тэарэтычнай і практычнай значнасці праведзенага даследавання. Выкарыстанне аўтарам дысертацыі разнастайных матэрыялаў і іх слушная інтэрпрэтацыя дазваляе аўтару зрабіць дэтальны аналіз прадмета даследавання і зрабіць разгорнутыя і змястоўныя высновы.

Дысертацыя С.М. Бітчанкі абапіраецца на палажэнні аб эвалюцыйным развіцці асветы і педагагічнай думкі Беларусі XIX – пачатку XX ст., аб заканамернасцях фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, беларускай адукацыі і культуры, аб канцэптуалізацыі ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі, аб фарміраванні гістарычнай памяці ў вучняў праз дыдактычнае канструяванне і вывучэнне зместу вучэбнага матэрыялу па айчыннай гісторыі.

Дысертацыя мае высокі ўзровень навізны. Аўтару дысертацыі ўдалося дастаткова поўна раскрыць дзяржаўна-ідэалагічныя, гістарыяграфічна-крыніцазнаўчыя, гісторыка-педагагічныя асновы даследавання эвалюцыі школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі; сканструяваць гісторыка-педагагічную мадэль стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі для беларускіх губерняў Расійскай імперыі; выявіць эвалюцыю канцэптуальна-ідэалагічных асноў гісторыі Беларусі ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі; вызначыць асаблівасці дыдактычнага канструявання структуры вучэбных тэкстаў і эвалюцыю вобразаў гістарычнага мінулага Беларусі ў зместавым

напаўненні школьнай вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм.

У цэлым, дысертацыя С.М. Бітчанкі з’яўляецца своечасовым і вельмі актуальным даследаваннем для беларускай гістарыяграфіі. Матэрыялы даследавання апублікаваны і апрабіраваны на міжнародных канферэнцыях. Трэба таксама звярнуць увагу на практычную значнасць праведзенага даследавання: матэрыялы і вывады дысертацыйнай работы могуць прымяняцца ў сферы адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь.

Паўната раскрываемых праблем і глыбіня праведзенага даследавання адпавядаюць патрабаванням, якія прад’яўляюцца да дысертацый, якія прадстаўляюцца на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук. Даследаванне С.М. Бітчанкі запатрабавана як у вобласці педагогікі, так і айчыннай гістарычнай навуцы.

Дэкан факультэта гісторыі
і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”
кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.А. Чаропка

Установа адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны»
ФАКУЛЬТЭТ ГІСТОРЫІ І
МІЖКУЛЬТУРНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

Подпіс С.А. Чаропкі завяраю:
спецыяліст М.А. Бруйкіна

З водзывам азнаёмлены 16.06.2023 С.М. Бітчанка